■ Заканатворчасць

# ПРАВА МЕЦЬ ПРАВЫ

## Што новага плануецца ўвесці ў закон «Аб грамадзянстве»

**Заўтра, 19 лістапада, дэпутаты ў другім чытанні плануюць разгледзець змяненні і дапаўненні ў праект закона «Аб грамадзянстве Рэспублікі Беларусь». Адказная за законапраект дэпутат Тамара КРАСОЎСКАЯ, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па правах чалавека, нацыянальных адносінах і сродках масавай інфармацыі, расказала карэспандэнту «Звязды», у чым асаблівасць гэтага дакумента:**

— Права на грамадзянства адносіцца да асноўных правоў чалавека. Яго яшчэ называюць «правам мець правы», паколькі грамадзянства ўстанаўлівае палітычныя, сацыяльна-эканамічныя сувязі чалавека з дзяржавай. Заканадаўства аб грамадзянстве, з аднаго боку, павінна гарантаваць дзяржаве абарону нацыянальных інтарэсаў у гэтай сферы, а з іншага — адпавядаць агульнапрынятым нормам і прынцыпам міжнароднага права ў галіне правоў чалавека.

Сярод асноўных навацый гэтага законапраекта — замацаванне прававых падстаў атрымання грамадзянства дзецьмі, у адносінах да якіх устанаўліваецца мацярынства. Уводзіцца магчымасць атрымання беларускага грамадзянства дзецьмі, што нарадзіліся на тэрыторыі нашай краіны і чые бацькі часова пражываюць у нас, з'яўляючыся асобамі без грамадзянства.

У адпаведнасці з палажэннямі законапраекта асобам, якія нарадзіліся пасля распаду Савецкага Саюза і з'яўляюцца нашчадкамі выхадцаў з нашай краіны, будзе прадастаўлена магчымасць атрымаць беларускае грамадзянства ў спрошчаным парадку. Мяркую, гэта будзе садзейнічаць прыцягненню ў краіну людзей, якія маюць беларускія карані.

Законапраект быў сур'ёзна перапрацаваны. У параўнанні з тэкстам праекта, прынятым у першым чытанні, у новай рэдакцыі прапанавана выкласці шэраг глаў і артыкулаў. Карэкціроўкі носяць у першую чаргу ўдакладняльны, тэрміналагічны і рэдакцыйны характар.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.** *yushkevich@zviazda.by*

■ Перспектыва

# У НАС ПЕРШЫ ВІРТУАЛЬНЫ БАНК МОЖА З'ЯВІЦЦА ЎЖО ПРАЗ ГОД

**Намеснік генеральнага дырэктара ІТ-кампаніі «СОФТКЛУБ» Дзмітрый ФІЛІМОНАЎ паведаміў, што ў нашай краіне ўжо ёсць усе перадумовы для стварэння віртуальнага банка. Гэта і развіццё лічбавага банкінгу ў Нацыянальным банку, і распрацоўка стратэгіі рэгулятарам на 2016-2020 гады, і падрыхтаваны праект указа аб лічбавых банкаўскіх тэхналогіях. «Лагічным працягам развіцця лічбавага банкінгу з'яўляецца поўная віртуалізацыя ўсіх банкаўскіх сэрвісаў, што на фінішы можа азначаць стварэнне так званага віртуальнага банка», — адзначыў эксперт.**

На яго думку, перспектыву ўзнікнення такой банкаўскай структуры рэальна ажыццявіць у нашай краіне ўжо ў 2017-2018 гадах. «У свеце такія банкі ўжо ёсць, у тым ліку ў краінах СНД», — дадаў спецыяліст.

Многія беларускія банкі ўжо цяпер абвяшчаюць аб імкненні стаць выключна віртуальнымі. Адзін з асноўных фактараў, які тармозіць працэс, — негатоўнасць да гэтага большасці сённяшніх кліентаў. «Аднак моладзь новага пакалення ўжо гатова абслугоўвацца ў цалкам віртуальных банках, — падкрэсліў прадстаўнік ІТ-кампаніі. — І мы таксама гатовы як распрацоўшчыкі. Адпаведнае праграмнае забеспячэнне ў нас ужо ёсць».

Лічыцца, што вырашальнае значэнне для паспяховай віртуалізацыі банкаўскіх працэсаў мае тэхналагічная гатоўнасць банкаў апрацоўваць інфармацыю ў рэжыме анлайн 24 гадзіны ў суткі 365 дзён у годзе. «Мы перайшлі той рубеж, калі кліенты хацелі і маглі чакаць, — падкрэсліў Дзмітрый Філімонаў. — Магчымасць правесці ўсе неабходныя банкаўскія аперацыі анлайн у любы час сутак асабіста для мяне — паказчык, што банк актыўны, інавацыйны і рэальна працуе над сваім развіццём».

Яшчэ адзін сусветны трэнд — амніканальны рытэйл, які ўяўляе з сябе інтэграваны падыход да пакупніка, калі ўсе дзеянні кліента ў розных дыстанцыйных каналах (сацсетках, інфакіёску, інтэрнэт-банкінгу) улічваюцца, аналізуюцца і яму аператыўна прапануецца персаналізаваны прадукт. «Некаторыя беларускія банкі ўжо выкарыстоўваюць элементы амнікальнасці, і, улічваючы, што гэта перспектыўны сусветны трэнд, думаю, 2017-2018 гады могуць стаць рухавіком у гэтым напрамку», — упэўнены эксперт.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

■ Тры пытанні да ўлады

# ПРЭСТЫЖ ШМАТДЗЕТНАЙ СЯМ'І



**Сям'я заўсёды была адным з прыярытэтаў нашай дзяржавы. Але дзяржаўная палітыка, як вядома, складаецца з мноства клопатаў раённага маштабу. Пра тое, як яна ажыццяўляецца ў адным з самых маленькіх раёнаў Брэсцкай вобласці, сённяшняя гутарка з намеснікам старшыні Ляхавіцкага райвыканкама Дзіянай ТРЫСЦЕНЬ.**

***— Дзіяна Іванаўна, якія тэндэнцыі праглядаюцца сёння ў дэмаграфіі раёна?***

— Я ахарактарызавала б іх як аптымістычныя. За 9 месяцаў гэтага года ў Ляхавіцкім раёне нарадзілася 234 немаўляці. Для параўнання: летась было 204. Як бачым, дзяцей нараджаецца больш. І гэта радуе. Сістэму выплат і дапамог у сувязі з нараджэннем і выхаваннем дзяцей у разрэзе нашага раёна з насельніцтвам у 26,6 тысячы можна праілюстраваць лічбай: за восем месяцаў гэтага года чатыры мільярды рублёў накіраваны на гэтыя мэты.

Калі я заязджаю ў любы сельсавет, то найперш іду на ФАП альбо ў амбулаторыю. І там разам з іншымі пытаннямі высвятляю, колькі жанчын стаяць на ўліку па цяжарнасці. Літаральна на гэтым тыдні ў адной з вёсак выдалі гэтую статыстыку. Маю ўвагу прыцягнуў узрост будучых мам, гэта былі жанчыны недзе ў раёне сарака гадоў. Медработнік адразу папярэдзіла мае іншыя пытанні і сказала, што сем'і добрыя, пайшлі на гэты крок жанчыны свядома, і дзеці будуць жаданымі. Значыць, мамы, у якіх ужо ёсць дзеці, узважылі свае магчымасці, найперш матэрыяльныя, і вырашылі нарадзіць яшчэ адно дзіця. Хіба не нагода для аптымізму?

І яшчэ, падчас стасункаў з маладымі бацькамі на раённых мерапрыемствах давялося заўважыць, што быць шматдзетнымі становіцца звыклым, нават прэстыжным у некаторых асяродках моладзі. Вядома, дзяржаўная падтрымка таксама ўплывае на рост колькасці шматдзетных сем'яў. У раёне такі статус маюць 344 сям'і, 34 з іх сталі такімі сёлета.

***— Ці паспрыяў гэтаму новы від доўгатэрміновай падтрымкі — сямейны капітал?***

— Пакуль цяжка сказаць. Норма дзейнічае толькі з гэтага года. І напачатку людзі не вельмі актыўна звярталіся па налічэнне сродкаў на банкаўскі рахунак. Можа, перспектыва скарыстацца грашыма праз 18 гадоў здавалася для некаторых вельмі далёкай, таму бацькі і не спяшаліся. У гэтай сувязі мы вырашылі правесці дадатковую тлумачальную работу. На Дзень сям'і запрасілі ўсіх патэнцыйных атрымальнікаў капіталу, расказалі падрабязна пра неабходныя для налічэння дакументы, парадак іх падачы і выгады ад банкаўскага рахунку, на які налічваюцца працэнты. І працэс пайшоў, шматдзетныя бацькі актывізаваліся. Па 31-й сям'і ўжо прынята рашэнне райвыканкама, яшчэ дзве падалі дакументы. Думаю, што гэта вельмі добры бонус сем'ям, якія адважыліся на трэцяе альбо чацвёртае (ці больш) дзіця.

***— Вядома, матэрыяльная падтрымка сем'яў з дзецьмі выходзіць на першы план. Але і маральная, накіраваная на павышэнне прэстыжу сям'і, мае не апошняе значэнне. Маю на ўвазе мерапрыемствы, конкурсы, работу ў працоўных калектывах...***

— Згодная з вамі. Мы робім упор не толькі на вялікія мерапрыемствы раённага маштабу, але і на сустрэчы, гутаркі ў калектывах на тых жа днях інфармавання, што сталі традыцыйнымі. Параўнальна нядаўна мне давялося весці гутаркі на названыя тэмы ў калектывах: у адным з іх большасць складаюць маладыя мужчыны, у другім пераважаюць жанчыны. Парадавала сур'ёзнае стаўленне да пытанняў сям'і моладзі абодвух палоў. Большасць з іх выказалі жаданне мець сям'ю, у якой выхоўваецца больш чым адно дзіця... Ну а з апошніх мерапрыемстваў найлепшыя ўражанні пакінула імпрэза на Дзень маці. Мы запрасілі матуль тых перадавікоў сельскай гаспадаркі, якіх ушаноўвалі на абласных «Дажынках». Падзякавалі ім за поспехі іх сыноў, за выхаванне працавітых дзяцей. Папрасілі жанчын расказаць пра сямейныя традыцыі ў выхаванні. Былі і падарункі, і добрыя словы, і слёзы радасці. Адным словам, свята атрымалася добрым.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.** *yackevich@zviazda.by*

# Прыём без прыёмнай

### Чыноўнікі ўсіх рангаў працягваюць выслухваць і вырашаць праблемы жыхароў краіны падчас прамых тэлефонных ліній

Традыцыйна па суботах з 9:00 і да 12:00 можна будзе датэлефанавацца да адказных асоб — намеснікаў кіраўнікоў выканкамаў гарадоў, раёнаў і абласцей. Такая форма зносін дапамагае вырашыць шматлікія праблемы без лішняй папяровай цяганіны і праводзіцца ў краіне з пачатку 2015 года.

**У гэтую суботу, 21 лістапада, на сувязь з насельніцтвам выйдуць:**

**Брэсцкі аблвыканкам**
ЛІС Анатоль Васільевіч — старшыня (80162213121);

**Віцебскі аблвыканкам**
МАЦЮШКА Аляксей Уладзіміравіч — кіраўнік спраў (80212204260);

**Гомельскі аблвыканкам**
КЛІЧКОЎСКАЯ Алена Уладзіміраўна — кіраўнік спраў (80232751237);

**Гродзенскі аблвыканкам**
АГЕЙ Алена Аляксандраўна — намеснік старшыні (80152735644);

**Мінскі аблвыканкам**
ПЛАЎСКІ Алег Альфрэдавіч — намеснік старшыні (5004160);

**Магілёўскі аблвыканкам**
ЧЫКІДА Алег Іванавіч — першы намеснік старшыні (80222501869);

**Мінскі гарвыканкам**
БІРЫЧ Жанна Эдуардаўна — намеснік старшыні (222 44 44).

■ Далучайся!

# СТВОРЫМ «ЗЯЛЁНУЮ КАРТУ» РАЗАМ

**Інтэрнэт-праект «Зялёная карта» (greenmap.by), які стартаваў у 2012 годзе, стане ўсебеларускім: цяпер на яе будуць нанесеныя ўсе гарады краіны. Для дапамогі ў рэалізацыі ідэі Цэнтр экалагічных рашэнняў шукае валанцёраў ва ўсіх рэгіёнах Беларусі.**

Як патлумачыла каардынатар праекта Марыя СУМА, дапамога патрабуецца разнапланавая: ад праверкі сабранай інфармацыі па нанесеных на карту гарадах да размяшчэння там новых населеных пунктаў.

— Акрамя таго, у шасці абласных цэнтрах мы хочам папоўніць карту яшчэ новымі тэмамі, — распавяла яна. — Блок «Экалагічная інфармацыя і арганізацыі» будзе ўтрымліваць даныя аб арганізацыях, якія прадстаўляюць насельніцтву экалагічную інфармацыю, консультацыі і паслугі.

Блок «Аднаўляльная энергетыка» сканцэнтруе інфармацыю аб дзеючых аб'ектах альтэрнатыўнай і аднаўляльнай энергетыкі.

Блок «Прыродныя тэрыторыі» будзе змяшчаць інфармацыю аб прыродных зонах у гарадах і паблізу ад іх. На карту нанясуць паркі адпачынку і ахоўныя прыродныя тэрыторыі.

Нагадаем, што раней «Зялёная карта» ўтрымлівала інфармацыю трох катэгорый: пра пункты прыёму другасных матэрыяльных рэсурсаў, небяспечных адходаў, а таксама пра месцы, куды можна аднесці рэчы для другаснага іх выкарыстання.

Сёння гэты інтэрнэт-праект аб'ядноўвае 26 гарадоў Беларусі, уключаючы ўсе абласныя цэнтры плюс 20 раённых. Усе астатнія гарады, як плануецца, з'явяцца на карце цягам наступнага года дзякуючы дапамозе валанцёраў.

Каб стаць валанцёрам, трэба да 1 снежня 2015 года звязацца з каардынатарам праекта па тэлефонах +375 17 334 18 15, +375 29 559 61 19 або па электроннай пошце greenmap@ecoidea.by.

**Надзея НІКАЛАЕВА.** *nikalaeva@zviazda.by*

■ Ініцыятыва

# МОЛАДЗЬ ДАЛУЧАЕЦЦА ДА УСЕАГУЛЬНАЙ КАНФЕДЭРАЦЫІ ПРАФСАЮЗАЎ

**З мая пры Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі працуе Маладзёжны савет. Пра першыя вынікі сваёй дзейнасці актывісты расказалі падчас другога пасяджэння савета.**

«Адна з нашых ініцыятыў — уключыць у Генеральнае пагадненне між урадам, аб'яднаннямі наймальнікаў і прафсаюзаў на 2016-2018 гады раздзел «Моладзь». У папярэднім дакуменце было прадстаўлена толькі два пункты, што тычацца маладых людзей. На наш погляд, яны не зусім адлюстроўваюць сацыяльную абароненасць гэтай катэгорыі. Неабходна больш падрабязна прапісаць усе гарантыі і правы маладых работнікаў на прадпрыемствах. Гэтую ініцыятыву падтрымаў старшыня ФПБ Міхаіл Орда. Канчатковае рашэнне будзе агучана на наступным пасяджэнні Нацыянальнага савета па працоўных і сацыяльных пытаннях. Стварэнне раздзела дазволіць пераносіць яго асобныя пункты ў тарыфныя пагадненні, калектыўныя дагаворы, каб палепшыць эканамічнае і прававое становішча моладзі», — адзначыў **старшыня Маладзёжнага савета ФПБ Арцём ІГНАЦЕНКА.**

У ліпені арганізацыя паспяхова правяла міжнародны форум «ТЕМП», які сабраў прафсаюзных прадстаўнікоў васьмі дзяржаў. Планы на наступны год — прыцягнуць да ўдзелу як мінімум 30 краін. Павялічыцца колькасць трэнінгаў, стане больш сустрэч з экспертамі.

Міжнароднае супрацоўніцтва будзе працягвацца не толькі ў рамках форумаў. Беларускіх актывістаў ужо запрасілі на пасяджэнне Усеагульнай канфедэрацыі прафсаюзаў, якое пройдзе 19-20 лістапада ў Маскве. Іх уключаць у Маладзёжны савет гэтага аб'яднання. «Так мы зможам цесна ўзаемадзейнічаць з усімі дзяржавамі СНД у галіне маладзёжнай палітыкі, — лічыць Арцём Ігнаценка. — Амаль ва ўсіх прафцэнтрах іншых краін маюцца маладзёжныя саветы. Будзем пераймаць вопыт. У нас гэта праца пакуль не наладжана. Некаторыя галіновыя прафсаюзы і рэгіянальныя прафаб'яднанні так і не прадставілі ніякай інфармацыі па стварэнні ў сябе маладзёжных камісій. Мы не ведаем, што там робіцца і ці робіцца ўвогуле».

Цяпер члены савета працуюць над уласнымі сацыяльнымі праектамі. Напрыклад, Ірына Белавус, урач-гігіеніст з Гродна, каб заахвоціць людзей да здаровага ладу жыцця, прапануе правесці ў горадзе тэматычны квэст (сюжэтную гульню) «Дзейнічай!». Падчас гульні маладыя медыкі, акрамя стандартнага праходжання маршруту, павінны будуць сабраць як мага больш прахожых і зрабіць на вуліцы разам з імі сацыяльную рэкламу, правесці агітацыю за здаровае харчаванне сярод пакупнікоў крамы. Калі пробная версія будзе ўдалай, квэст стане штогадовай традыцыяй.

Юрысконсульт з Чэрвеня Дзяніс Гуменюк лічыць, што трэба падтрымліваць прадпрымальнікаў з моладзі. Для гэтага можна стварыць біржу дзелавых ініцыятыў — шырокую сістэму суправаджэння бізнесменаў-пачаткоўцаў. Спецыялісты біржы дапамогуць маладым людзям, якія хочуць рэалізаваць свае ідэі, распрацаваць бізнес-план, пратэсціраваць праекты, каб выявіць недахопы і прыцягнуць інвестыцыі.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.** *lubneuskaya@zviazda.by*

■ Інавацыі

# «ЗОРКАЕ ВОКА» ДЛЯ ЧЫГУНКІ

**Унікальную распрацоўку — сістэму аддаленага маніторынгу працы лакаматываў — прэзентаваў Інавацыйна-тэхнічны цэнтр Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта інфарматыкі і радыёэлектронікі.**



Сістэма маніторынгу дазваляе службам чыгункі ў рэжыме рэальнага часу атрымліваць аператыўныя даныя па 23 параметрах, уключаючы месца знаходжання лакаматыва, рэжымы працы рухальнай устаноўкі, тармазной сістэмы, інфармацыю па спажыванні паліва. Усе яны па канале GPRS перадаюцца на сервер дэпо, дзе аналізуюцца сістэмай у аўтаматычным рэжыме. Прапанаваная тэхналогія дазваляе аператыўна ацаніць эфектыўнасць выкарыстання лакаматыва, весці падлік сабекошту перавозак, папярэджваць аварыйныя сітуацыі ў эксплуатацыі цягнікоў.

Па словах дырэктара цэнтра Анатоля Кузьміча, у першы год выкарыстання сістэмы эканомія паліва дасягае ў сярэднім 15%, а ў некаторых выпадках можа даходзіць і да 30%.

Сістэма маніторынгу — вынік сумеснай працы БДУІР і Рыжскага інстытута транспарту і сувязі. Сістэма ўжо паспяхова эксплуатуецца на Латвійскай чыгунцы. Там ёй аснашчаны ўвесь парк грузавых і манеўровых лакаматываў. Сумарны эфект ад прымянення сістэмы дасягнуў 20% ад сабекошту прадукцыі.

— Сёння мы маем ужо багаты вопыт як па стварэнні сістэм маніторынгу для транспарту або аб'ектаў інфраструктуры, так і па распрацоўцы асобных кампанентаў сістэм, — дадаў Анатоль Кузьміч. — У нас паспяхова рэалізаваны праекты з прадпрыемствамі «Гомсельмаш» і МТЗ. Усе кампаненты — уласнай вытворчасці.

**Надзея НІКАЛАЕВА.** *nikalaeva@zviazda.by*

■ Спажывец

# БУДМАТЭРЫЯЛЫ Ў АСАРТЫМЕНЦЕ

### Буйнагабарытны тавар прадавец абавязаны дапамагчы загрузіць

**Апошнім часам у Міністэрства гандлю пачасціліся звароты ад суб'ектаў гаспадарання, якія займаюцца вытворчасцю будаўнічых вырабаў і матэрыялаў: дзвярэй, вагонкі, ламінату, паркету і г.д.**

У гэтай сувязі плануецца ўзмацніць кантроль за выкананнем арганізацыямі гандлю асартыментных пералікаў у плане наяўнасці ў продажы будаўнічых матэрыялаў айчыннай вытворчасці. Апроч таго, як паведамілі ў міністэрстве, падчас кантрольных мерапрыемстваў асаблівая ўвага будзе нададзена таму, як крамы захоўваюць правілы продажу будаўнічых матэрыялаў і вырабаў. Так, згодна з заканадаўствам, прадавец павінен забяспечыць бясплатную пагрузку буйнагабарытных і масай звыш 25 кілаграмаў будаўнічых матэрыялаў і вырабаў у транспартны сродак пакупніка.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

**Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь глыбока смуткуюць у сувязі са смерцю Надзвычайнага і Паўнамоцнага Пасла Рэспублікі Беларусь у Федэратыўнай Рэспубліцы Германія Андрэя Уладзіміравіча ГІРО і выказваюць глыбокае спачуванне яго родным і блізкім.**

**Выдавецкі дом «Звязда» смуткуе ў сувязі са смерцю Андрэя Уладзіміравіча ГІРО, Надзвычайнага і Паўнамоцнага Пасла Рэспублікі Беларусь у Федэратыўнай Рэспубліцы Германія, і выказвае глыбокае спачуванне яго родным і блізкім.**


**Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»**

## ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА

| Наименование | Характеристика |
|---|---|
| ЛОТ 1 | |
| Наименование объекта, краткая характеристика, адрес расположения | Капитальное строение, инв. № 431/С-25800 (назначение – здание специализированное розничной торговли, наименование – здание магазина), общей площадью 129,8 кв.м, расположенное по адресу: Кореличский р-н, г.п. Кореличи, ул. Октябрьская, 41А |
| Земельный участок | Кадастровый номер 423355100001001465, площадью 0,0861 га (назначение – земельный участок для обслуживания здания специализированного розничной торговли) по адресу: Кореличский р-н, г.п. Кореличи, ул. Октябрьская, 41А. Примечания: земельный участок имеет ограничения (обременения) прав в использовании земель: земельный участок, расположенный в охранной зоне линий электропередачи, код – 13,2, площадь 0,0142 га |
| Начальная цена продажи | 144 000 000 (сто сорок четыре миллиона) белорусских рублей с учетом НДС |
| Сумма задатка | 14 400 000 (четырнадцать миллионов четыреста тысяч) белорусских рублей |
| Продавец | Кореличский филиал Гроднооблпотребобщества, 231430, г.п. Кореличи, ул. 8 Марта, 28 |
| Организатор торгов | Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел.: 41-98-32, 41-98-34 |
| Условия аукциона | Введение объекта в эксплуатацию |
| Условия оплаты | По договоренности сторон |
| Срок заключения договора купли-продажи | Не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов |
| Номер р/с для перечисления задатка | р/с 301 257 917 0017 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, БИК 153001739, УНП 500833225 |

**Аукцион состоится 10 декабря 2015 г. в 11.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209**

К участию в аукционе допускаются физические лица, юридические лица и индивидуальные предприниматели, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона с указанием даты регистрации заявления и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» подается заявление на участие в аукционе со следующими документами:
заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении;
*юридическим лицом – резидентом Республики Беларусь* – копия документа, подтверждающая государственную регистрацию юридического лица;
*индивидуальным предпринимателем* – документ, подтверждающий государственную регистрацию индивидуального предпринимателя, и его копия, которая заверяется организатором аукциона;
*юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь* – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с удостоверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе организатору аукциона предъявляются:
представителем юридического лица, индивидуального предпринимателя – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность этого представителя;
физическим лицом – документ, удостоверяющий личность физического лица;
представителем физического лица – доверенность и документ, удостоверяющий личность представителя.

Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором аукциона день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата его регистрации в журнале регистрации заявлений на участие в аукционе. Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона.

В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов по названной аукционистом цене. Данный участник объявляется победителем торгов. Если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним лицом, предмет аукциона продается этому лицу при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

**Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» от 18.07.2015 г.**

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница)**

**Последний день приема заявлений – 04 декабря 2015 г. до 15.00**

**Телефон для справок: 45-05-38 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»**



**Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»**

## ИЗВЕЩАЕТ ОБ АУКЦИОНЕ ПО ПРОДАЖЕ ПРАВА ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРА АРЕНДЫ ПОМЕЩЕНИЯ

| Наименование | Характеристика |
|---|---|
| ЛОТ 1 | |
| Наименование объекта, краткая характеристика, местонахождение объекта | Право заключения договора аренды сроком 5 лет капитального строения, инв. № 400/С-93365 (назначение – здание специализированное железнодорожного транспорта, наименование – пункт техобслуживания погрузчиков), общей площадью 219.0 кв.м по адресу: г. Гродно, ул. Аульская, 16А |
| Начальная цена продажи | 2 365 200 (два миллиона триста шестьдесят пять тысяч двести) белорусских рублей с учетом НДС |
| Коэффициент к базовой арендной величине по договору аренды | 0,3 х 0,8 х 1,5. Размер ежемесячной арендной платы – 0,36 базовой арендной величины за 1 кв.м |
| Сумма задатка | 236 520 (двести тридцать шесть тысяч пятьсот двадцать) белорусских рублей |
| Продавец | УП «Барановичское отделение Белорусской железной дороги» Барановичский грузовой центр транспортной логистики, 225413, г. Барановичи, ул. Брестская, 272 Тел. 8-0163-49-27-28 |
| Организатор торгов | Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел.: 41-98-32, 41-98-34 |
| Условия аукциона | Целевое назначение арендуемых помещений – для оказания услуг |
| Условия оплаты | По договоренности сторон |
| Срок заключения договора аренды | Не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов |
| Номер р/с для перечисления задатка | р/с 301 257 917 0017 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, БИК 153001739, УНП 500833225 |

**Аукцион состоится 21 декабря 2015 г. в 11.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3**

К участию в аукционе допускаются физические лица, юридические лица и индивидуальные предприниматели, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» подается заявление на участие в аукционе со следующими документами:
- заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении;
- *юридическим лицом – резидентом Республики Беларусь* – копия документа, подтверждающая государственную регистрацию юридического лица;
- *индивидуальным предпринимателем* – документ, подтверждающий государственную регистрацию индивидуального предпринимателя, и его копия, которая заверяется организатором аукциона;
- *юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь* – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с удостоверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе организатору аукциона предъявляются:
- представителем юридического лица, индивидуального предпринимателя – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность этого представителя;
- физическим лицом – документ, удостоверяющий личность физического лица;
- представителем физического лица – доверенность и документ, удостоверяющий личность представителя.

Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором аукциона день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата его регистрации в журнале регистрации заявлений на участие в аукционе. Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона.

В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов. Если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним лицом, предмет аукциона продается этому лицу при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30. до 16.30 (пятница)**

**Последний день приема заявлений – 15 декабря 2015 г. до 15.00**

**Телефон для справок: 45-05-38 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»**